# Краязнаўчая газета

№ 30 (479)
Жнівень 2013 года

Выдаецца з красавіка 2003 года www.bfk.by


## У нумары:


☞ Супрацоўніцтва: *яднае Беларусь і Літву род Агінскіх* – *стар. 2*

☞ Асоба: *Леў Позняк і яго народны хор* – *стар. 2 і 6*

☞ Скансэн: *архітэктура з геаграфіяй* – *стар. 5*





*На фота Кацярыны МЯСНІКОВАЙ: царква Праабражэння Гасподняга, пабудаваная ў 1750-х гг.*

## На тым тыдні...

✓ У гарадскім пасёлку Дрыбін **3 жніўня** прайшоў **трэці рэгіянальны фестываль народнай творчасці «Дрыбінскія таржкі»**. Ягоная мэта – падтрымка мясцовай традыцыі валяння. Тамтэйшыя майстры праславіліся шапавальствам – вырабам магерак, або цёплых шапак. З ранку адкрыліся мастацкі вернісаж і горад майстроў, прайшлі майстар-класы народных промыслаў і рамёстваў. Працавалі розныя крамы – «Зёлкі», «Шалёная бжылка» (мёд, ласункі, медавуха), «Селядцы», «Вада жыцця» (крынічная вада на зёлках), «Добра скеніць!» (продаж страваў нацыянальнай кухні), «Дрыбінскія бусавы» (продаж валёнак) ды інш. Вітала наведнікаў і «Літаратурная гасцёўня», дзе прайшлі паэтычныя чытанні мясцовых творцаў. У свяце бралі ўдзел майстры народных промыслаў з усёй Беларусі, а таксама калектывы мастацкай самадзейнасці – ансамбль народнай музыкі «Світанак», яўрэйскі народны тэатр «Шалом» з Магілёва, народны вакальны калектыў «Славяне» з Украіны і многія іншыя.



✓ **7 жніўня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прайшло **адкрыццё фотавыстаўкі Вольгі Савіч «Скарбонка Часу»**. На здымках – фрагменты архітэктуры Мінска, мастачка фіксуе тое, на чым звычайна не спыняюць увагу фатографы: цені, расколіны, нечаканыя спалучэнні формаў ды фактураў. На здымках – канкрэтны горад, але няма прыкметаў канкрэтнага часу. Гэта могуць быць і 1970-я, і 1990-я гг., а можа, і 2040-я. В. Савіч паказвае пазачасавасць – тэрыторыю не толькі тых, хто адышоў, але і тых, хто адыдзе, – трывожную, няўлоўную прастору, што лучыць усіх нас. Пранізлівае разуменне таго, што ўсё мінае, дазваляе больш востра і выразна адчуць сваё ўласнае знаходжанне ў свеце.

Выстаўка працягнецца да 24 жніўня.

✓ **8 жніўня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка «Выратаваныя каштоўнасці»**. Яна дзейнічае ў рамках доўгатэрміновага выставачнага праекта **«Культура не ведае правінцыі»**, мэта якога – паказаць унікальныя музейныя калекцыі абласных і раённых музеяў краіны. Гэтым разам прадстаўлены збор музея «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» – філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Гэта адзіны ў Беларусі і СНД музей, дзе экспануюцца творы мастацтва і прадметы антыкварыяту, канфіскаваныя пры спробе незаконнага вывазу іх за мяжу. Прадстаўлена звыш 300 помнікаў гісторыі і культуры, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Дэманструюцца помнікі нумізматыкі і баністыкі VI–XX стст., паясы і кінжалы, творы мастацтва краінаў Усходу і іншае. Адной з найбольш цікавых частак экспазіцыі з'яўляецца калекцыя абразоў XVIII–XX стст. Дапаўняюць экспазіцыю сакральнага мастацтва ўзоры растоўскай фініфці і рускага меднага ліцця, рарытэтныя кніжныя выданні.

*Падрабязней чытайце на стар. 4*

✓ **9 жніўня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь і Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі адкрылася **выстаўка «Пад знакам Меноры. З гісторыі яўрэйства на Беларусі»**, прысвечаная 90-гадоваму юбілею дзейнага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса і 100-годдзю з дня нараджэння былога прэм'ер-міністра Ізраіля Менахема Бегіна. Менавіта на беларускай зямлі нарадзіліся гэтыя дзяржаўныя дзеячы. Фотаматэрыялы, спецыяльна прывезеныя з Ізраіля, знаёмяць наведнікаў з біяграфіямі Ш. Перэса і М. Бегіна. Арыгінальныя рэчы яўрэйскага побыту, рытуальныя прадметы пакажуць атмасферу яўрэйскага мястэчка першай трэці XX ст.

*Падрабязней на стар. 4*




# Шлях культуры Агінскіх: *стратэгічны накірунак*

У канцы ліпеня ў літоўскім горадзе Рэтавас з ініцыятывы Маладзечанскага Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» і пры падтрымцы Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх прайшоў круглы стол «Беларусь – Літва: на шляху культурнага супрацоўніцтва». У ім прынялі ўдзел кіраўнікі ўстаноў культуры Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацыяў і бізнес-саюзаў. Асноўнымі мэтамі круглага стала былі падвядзенне вынікаў сумеснай працы, накіраванай на адраджэнне культурнай спадчыны роду Агінскіх, і вызначэнне прыярытэтных напрамкаў супрацоўніцтва на перыяд 2013–2015 гг.

У сучасных умовах глабалізацыі менавіта міжнародныя праекты становяцца моцнымі сродкамі дыпламатыі і механізмам сацыякультурнай інтэграцыі. Прызнаючы важнасць сумесных міжнародных акцыяў і праектаў у развіцці міжкультурнага дыялогу Літвы, Беларусі і іншых краінаў Еўропы, мэр горада Рэтавас Антанас Чарнецкіс адзначыў: «Мы аб'ядноўваем людзей розных краінаў са сваёй унікальнай культурнай спадчынай. Разнастайнасць і творчае багацце – умова поспеху на культурным шляху».

Дырэктар Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага Р. Сарока і дырэктар Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх В. Руткаўскас, станоўча адзначаючы культурныя мерапрыемствы, рэалізаваныя ў 2011–2013 гг. у межах міжнародных праграмаў «Масты спадчыны Агінскіх» і «Шляхамі паланэзаў Агінскага», абвясцілі асноўныя накірункі далейшага супрацоўніцтва. «Наш праект адкрыты ўсім зацікаўленым і неабыякавым да нашай агульнай культуры і гісторыі. Спадзяюся на ўзбагачэнне нашага культурнага асяродку новымі ідэямі і цікавымі праектамі ў розных сферах творчай дзейнасці», – адзначыў В. Руткаўскас. Сапраўды, толькі агульнымі намаганнямі энергічных творчых асобаў магчыма паспяховая рэалізацыя любога праекта.

Адзначым, што пры ўдзеле фонду «Спадчына М.К. Агінскага» былі праведзены міжнародная навуковая канферэнцыя «Палітычная і культурная дзейнасць князёў Агінскіх: рэфлексіі мінулага, перспектывы будучыні» (Вільня), моладзевы баль (сумесна з духоўна-асветніцкім аб'яднаннем «Светач» Палаца культуры г. Маладзечна), выстаўка беларускіх мастакоў у Мінскім абласным краязнаўчым музеі, мастацкі пленэр і іншыя. Распрацаваны шэраг турыстычных маршрутаў па Беларусі, Літве і Польшчы. Усталяваныя кантакты і падпісаныя дамовы з калегамі са Швецыі і Італіі, аб чым таксама ішла гаворка пад час працы круглага стала.

Рэжысёр культурных праграмаў Віргінія Кахансkіце, распавядаючы аб праграме «Шлях паланэзаў Агінскага», засяродзіла ўвагу на яе асветніцкім і іміджавым аспектах. Нагадаем чытачам, што ў межах дадзенай праграмы быў рэалізаваны міжнародны музычны праект – гастрольнае турнэ «Музыка княжацкага роду Агінскіх» (Рэтавас–Вільня–Маладзечна–Мінск–Масква) сумесна з Расійскай акадэміяй музыкі імя Гнесіных (Масква) і Нацыянальнай школай мастацтваў імя Чурлёніса (Вільня).

З цікавымі прапановамі на круглым стале выступілі загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прафесар А. Смолік, краязнаўца С. Верамейчык, старшыня Мінскага згуртавання нашчадкаў шляхты і дваранства І. Чакалаў, дырэктар Нацыянальнага музея імя М.К. Чурлёніса О. Даўгеліс, дырэктар Жэмайційскага мастацкага музея А. Баканаўскас і іншыя.

Кульмінацыяй мерапрыемства стаў прагляд дакументальнай стужкі аб жыцці і творчасці М.К. Агінскага, знятай РУП «Беларускі відэацэнтр» (рэжысёр Анастасія Мірашнічэнка).

У бліжэйшы час плануецца распрацаваць міжнародную культурную праграму «Шлях культуры Агінскіх», прымеркаваную да святкавання 250-годдзя з дня нараджэння кампазітара, разам з нацыянальнымі камісіямі па справах ЮНЕСКА Беларусі і Літвы пры падтрымцы ідэі міністэрствамі культуры і замежных справаў нашых краінаў.

Па выніках круглага стала была падпісаная рэзалюцыя, у якой вызначаны шэраг мерапрыемстваў на 2013–2015 гг.

*Павел САПОЦЬКА*



Фота Ірыны РУХЛІ

# Кіраўнік хору

## «Аб нечым расказвае і малюе формулы, як песню спявае»

***Старажылы Смілавічаў з гонарам успамінаюць, што песню Уладзіміра Алоўнікава на словы Адама Русака «Лясная песня» (вядомая таксама пад назвай «Ой, бярозы ды сосны») у першыя гады пасля яе стварэння беларускае радыё транслявала ў выкананні Смілавіцкага народнага хору пад кіраўніцтвам Льва Позняка.***



Леў Позняк, які нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў у 1896 годзе, быў чалавекам энцыклапедычных ведаў. У пасляваенныя гады выкладаў у Смілавіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме і мясцовай сярэдняй школе фізіку, матэматыку, хімію, біялогію. Добра вядома, што шчаслівае спалучэнне ведаў і ўменне перадаць іх іншым сустракаецца не ў многіх, але ў выкладчыка Л. Позняка яго хапала. У юнацкім узросце ён працаваў у памешчыка Льва Ваньковіча, а ў час вайны, застаўшыся ў акупаваных Смілавічах, вымушаны быў працаваць у немцаў на «пільні», як смілавічане звалі лесапілку. У 1947 годзе Леў Міхайлавіч перажыў жудасную трагедыю: маланка забіла яго 17-гадовую прыгажуню-дачку, калі яна прасавала бялізну.

Калі Леў Міхайлавіч чытаў лекцыі, навучэнцы сядзелі як заваражаныя, нават на прадметах, якія не любілі, напрыклад, хіміі. На экзаменах выкладчык быў добразычлівым і ніколі не выстаўляў нездавальняючых адзнак. На яго лекцыях не трэба было праводзіць праверак наведвання, бо ўсе з затоеным дыханнем слухалі выкладчыка, які дапамагаў асэнсаваць глыбіню жыцця з пункту гледжання матэматыкі, фізікі, хіміі. Яркі педагог застаўся ў памяці вучняў прыкладам найвышэйшай інтэлігентнасці, дэмакратычнасці і прафесіяналізму.

*Заканчэнне на стар. 6*



Рака Волма ў ваколіцах Смілавічаў

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

**АБАНЕМЕНТ** *на газету* 63320 (індэкс выдання)

**Краязнаўчая газета**

Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету 63320 (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

**Краязнаўчая газета**

Кошт: падпіскі ________руб.; пераадрасоўкі ________руб. Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

**Індывідуальная падпіска Індэкс 63320**

1 месяц 15 850 руб.

3 месяцы 47 550 руб.

6 месяцаў 95 100 руб.

*Каб быць разам з «Краязнаўчай газетай» да канца года – не забудзьцеся падпісацца, сябры!*

# Творчасці нішто не замінае



Напрыканцы ліпеня ў Лунінецкай раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі паэткі з Баранавічаў Галіны Ліс «Валошкавыя мары».

Чаму ў Лунінцы? А таму што жанчына родам з гэтых мясцінаў. Яна нарадзілася ў вёсцы Багданаўка Лунінецкага раёна. Прафесійную адукацыю атрымала ў Маладзечне (уліковапланавы тэхнікум) і Гомелі (кааператыўны інстытут). Цяпер жыве ў Баранавічах, мае ўласны бізнес.

Нягледзячы на «сухую» прафесію, Г. Ліс піша выдатныя вершы, якія неаднаразова друкаваліся ў баранавіцкай раённай газеце «Наш край», а таксама ў калектыўных зборніках «Дыханнем адзіным» і «Паэзія 2010».

І вось цяпер – уласная кніга. Трэба адзначыць, што Г. Ліс яшчэ і цудоўна малюе, піша карціны.

Са словамі прыхільнасці да творчасці паэткі на сустрэчы выступілі баранавіцкія госці Раіса Раманчук, Алесь Корнеў, Міхась Маліноўскі, Сяргей Карповіч. Цікава было паслухаць і гаспадароў імпрэзы – Вадзіма Жылко, Людмілу Хмялеўскую, Сцяпана Нефідовіча, Віктара Філатава, Таццяну Качаноўскую і інш.

У цёплай сяброўскай атмасферы баранавіцкія і лунінецкія творцы абмяняліся думкамі пра сучасную беларускую літаратуру, чыталі вершы і празаічныя ўрыўкі.

*Аляксей ШАЛАХОЎСКІ*

# У краязнаўчую скарбонку Наваполацка

Свой фонд краязнаўчых метадычных матэрыялаў аб родным горадзе значна папоўніла бібліятэка імя Якуба Коласа ў час падрыхтоўкі да 55-гадовага юбілею Наваполацка. Аўтар гэтых радкоў склала крыжаванку «Наваполацк культурны», якая была апублікаваная ў мясцовай «Новай газеце». Вучні з пакоя школьнікаў «Надзея» з задавальненнем разгадвалі пытанні электроннай віктарыны «Мой горад» і, трэба зазначыць, паказалі выдатныя веды.

У Наваполацку ў студзені 1967 года было створанае літаратурнае аб'яднанне «Крыніцы». Першым кіраўніком яго бюро быў абраны будучы знакаміты паэт Валянцін Лукша. У літаратурным жыцці горада гэтае аб'яднанне адыграла значную ролю. Хутка «Крыніцы» сталі вядомымі і ў краіне. Тут акрыяў талент многіх выдатных беларускіх пісьменнікаў: Навума Гальпяровіча (у мінулым годзе ён стаў ганаровым грамадзянінам Наваполацка), Уладзіміра Арлова, Ірыны Жарнасек, Міхася Барэйшы, Алега Мінкіна, Валянціны Аколавай, Сержука Сокалава-Воюша і многіх іншых.

Мы назапасілі некаторыя матэрыялы пра гісторыю літаратурнага аб'яднання «Крыніцы», узялі інтэрв'ю ў некаторых яго сяброў і інш. Так узнікла тэматычная папка ««Крыніцы»: з гісторыі наваполацкага літаратурнага аб'яднання». У юбілейную нядзелю чытачам бібліятэкі былі прапанаваны аповед пра пісьменнікаў «Крыніцы» з дэманстрацыяй іх кніг і віктарына пра аб'яднанне ў электронным выглядзе.

На сайце Наваполацкай ЦБС была змешчаная фотавіктарына «Наваполацк: нечаканы ракурс», дзе на фотаздымках былі прадстаўленыя віды горада, знятыя з незвычайных кропак. А дакладна паведаміць месцы, дзе праводзіліся здымкі, мы паабяцалі праз месяц.

Асаблівай папулярнасцю карысталася і карыстаецца (бо працягнуць яе экспанаванне было вырашана з-за вялікай да яе цікавасці) фотавыстаўка «История Новополоцка в лицах: фотографии из семейных архивов», падрыхтаваная клубам сяброў культуры «Вытокі», які ўжо шмат год працуе пры бібліятэцы імя Якуба Коласа. Выстаўка аформленая на вітрынах бібліятэкі. Прыемна, што да яе падыходзяць людзі розных узростаў, сем'ямі, уважліва разглядаюць рэтраздымкі, а потым завітваюць у бібліятэку. Наведнікі цікавяцца кнігамі пра Наваполацк, прадстаўленымі на кніжнай выстаўцы «Мой любы горад», і матэрыяламі краязнаўчай тэматыкі, напрыклад, брашурай «Новополочане – победители XXI века», падрыхтаванай да 55-годдзя горада.



Наваполацк напрыканцы XX ст.

За тры месяцы да юбілею горада бібліятэка аб'явіла акцыю «Новополочане самые-самые ...: аргументы и факты», мэтай якой было выявіць факты пра самыя значныя перамогі навапалачанаў ва ўсіх галінах прафесійнай і творчай дзейнасці. Па выніках гэтай акцыі планавалася скласці і выдаць буклет, таксама зрабіць яго электронны варыянт. Улічваліся асабістыя і калектыўныя дасягненні. Нягледзячы на тое, што нашыя землякі аказаліся даволі сціплымі і не вельмі спяшаліся паведаміць пра свае поспехі, буклет пабачыў свет. Перамогаў у навапалачанаў сапраўды шмат, асабліва ў спорце. Была прагледжаная мясцовая прэса з 2000 года, выпісаныя ўсе факты. Гатовы прадукт выдавецкай дзейнасці называецца «Навапалачане – пераможцы ў XXI стагоддзі: аргументы і факты» і мае два раздзелы: «Асабістыя перамогі» і «Пераможцы-калектывы»; спорт выдзелены асобна. Фактаграфічны матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку прозвішчаў пераможцаў і назваў калектываў, да кожнай пазіцыі пададзеная бібліяграфія.

Падрыхтоўка да юбілею горада дала дадатковы імпульс краязнаўчай працы бібліятэк, станоўча паўплывала на патрыятычнае выхаванне маладога пакалення гараджанаў.

*Валянціна СОПІКАВА*

# «З-пад вытокаў Нёманскіх»

Выстаўка з такою назвай сабрала ў ліпені наведнікаў Уздзенскага гісторыка-краязнаўчага музея на сустрэчу з мастацтвам жывапісу і скульптуры. Чатыры непаўторныя аўтары – Андрэй Лычкоўскі, Мікалай Мішчанка, Алесь Філіповіч і малады скульптар Яраслаў Філіповіч – стварылі цікавы групавы праект, якому дала пачатак уздзенская зямля. Як Нёман нараджаецца на нашай зямлі, а бяжыць у свет, так паляцiць, як птушка, гэты творчы праект па нашай краіне, да якога будуць далучацца іншыя майстры. Квартэт вытворцаў прадставіў для гледачоў творы, выкананыя ў розных тэхніцы жывапісу і скульптуры.

Натхнёны роднымі краявідамі мастак, настаўнік СШ № 2 імя Кандрата Крапівы А. Лычкоўскі, паказаў усю прыгажосць роднай зямлі. Зачароўваюць палотны «Вясна», «Клёны», «Старыя вербы», «Летам», «Восень» і інш.

Шматлікія нацюрморты М. Мішчанкі – «Бэз», «Кветкі», «Жоўтыя ружы» і інш., напісаныя акварэллю, акунулі нас у асалоду лета; сакавітыя кавуны запрашалі да карціны-стала і закранаі патаемныя струны нашых жаданняў.

Пейзажы А. Філіповіча «Паставы», «Укрыжаванне» і інш. завочна знаёмілі гледачоў з непаўторнымі мясцінамі нашай радзімы і дазвалялі палюбавацца іх краявідамі.

Скульптуры Я. Філіповіча «Муза», «Ветрык», «Залатая антылопа», «Лось», «Чароўны арэх» і інш. аздаблялі выстаўку незвычайнасцю, пранікнёнасцю пачуццяў, пластычнасцю выканання, аўтарскім светапоглядам. Працы створаныя з розных матэрыялаў: бронза, пластылін, дрэва, алюміній. Асобнай увагі заслугоўваў макет скульптуры Кандрата Крапівы, які аўтар марыць падарыць уздзенцам. На ім класік – быццам сейбіт баек. Дзеля гэтага распрацоўваецца праект алеі дзядзькі Кандрата, дзе разам з помнікам будуць знаходзіцца героі яго баек – «Дзед і баба», «Дыпламаваны баран» і інш.

Вядучая свята супрацоўнік музея Зоя Калкоўская расказвала прысутным пра аўтараў, задавала ім пытанні, вяла аповед пра іх творчую дзейнасць, чытала для іх свае вершы.

Праспяваў песні пад гітару аб Уздзеншчыне, аб мастаках, аб сяброўстве Алег Каламіец – метадыст раённага цэнтра культуры.

Са словамі ўдзячнасці да мастакоў звярталіся дырэктар музея Тамара Лухверчык, мясцовы краязнаўца Васіль Лычкоўскі, паэтэса Тамара Каляда.

Госці свята высока ацанілі творы майстроў, выказвалі меркаванні наконт працягу такіх мерапрыемстваў. Сярод іх былі начальнік ідэалагічнага аддзела Уздзенскага райвыканкама Н. Кананенка, мастацтвазнаўца, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Я. Шунейка, сябра Беларускага саюза мастакоў Я. Гоманаў, які напрыканцы праграмы падарыў карціны арганізатарам выстаўкі, дырэктар Уздзенскага сельскагаспадарчага ліцэя В. Фалейчык, які падзяліўся планамі правядзення рэстаўрацыі кальвінскага збору і запрасіў усіх наведаць наступную выстаўку – ужо ў ліцэі.

Ахвочыя змаглі пакінуць водгукі ў памятнай кнізе музея, а таксама пазнаёміцца са шматлікімі краязнаўчымі матэрыяламі, прадстаўленымі ў часопісным і DVD-выданні інтэрнэт-музея «Выток Нёмана».

Удзячныя аматары мастацтва будуць з нецярпеннем чакаць наступнай сустрэчы са святам прыгажосці.

*Ірына БЕЛЬСКАЯ,*
*бібліятэкар СШ № 1 імя А.С. Пушкіна,*
*г. Узда*

# Рыхтавацца да школы запрашаюць у музеі

***Дзяржаўны літаратурны-мемарыяльны музей Якуба Коласа прапануе новы спецыяльны праект «Крочым у школу разам з Коласам», які дапаможа дзіцяці не толькі псіхалагічна падрыхтавацца да школы, але і цікава правесці час. Запланаваныя восем заняткаў.***

**Заняткі 1. «Добры дзень, музей!»** Знаёмства з музеем класіка, творамі пісьменніка для дзяцей. Інтэрактыўная гульня «Таямніцы дома Песняра» і лялечны спектакль «Савось-распуснік».

**Заняткі 2. «Творчая майстэрня».** Лялечны спектакль паводле народнай казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа «Як кот звяроў напалохаў». Майстар-клас па вырабе свісцёлак з салёнага цеста.

**Заняткі 3. «Ты ўмееш маляваць?!» па тэхналогіі французскай майстэрні.** Стварэнне асацыятыўных малюнкаў паводле верша «Савось-распуснік». Чытанне гэтага твора з запісам на дыск.

**Заняткі 4. «Дарагі мой каляндар, няхай наступны будзе ў дар!»** З гісторыі з'яўлення календара. Хобі Якуба Коласа – калекцыянаванне настольных календароў. Майстар-клас па стварэнні вечнага календара.

**Заняткі 5. Янка Маўр – сябар і сваяк Якуба Коласа.** Рэтра-кінапаказ «Неадкрытыя астравы» паводле аповесці «Палескія рабінзоны».

**Заняткі 6. «Паэтычная майстэрня».** Сустрэча з дзіцячым пісьменнікам. Гульня «Мы гуляем – рыфмы падбіраем».

**Заняткі 7. «Творчая майстэрня».** З гісторыі паштовак. Паштоўкі пачатку XX стагоддзя з фондаў музея Якуба Коласа. Майстар-клас па іх вырабе. Удзел у стварэнні сувенірнай музейнай паштоўкі з уласным фотаздымкам.

**Заняткі 8. Заключныя.** Падвядзенне вынікаў. Напісанне пажаданняў на паспяховы навучальны год пяром Якуба Коласа.

***Плануюцца па 2 заняткаў на тыдзень. Аплата за іх невялікая; задаць пытанні і пакінуць заяўкі на ўдзел у праекце можна па тэл. у Мінску 284-17-02.***

*Паводле*
*інфармацыі арганізатараў*

Наш каляндар

# «Мне так хочацца вясёла прывітацца...»

***Сёлета спаўняецца 105 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Юркі Лявоннага (сапр. Леанід Мікалаевіч Юркевіч).***

Ён нарадзіўся напрыканцы ліпеня 1908 года ў Чавусах Магілёўскай губерні. Паходзіў з сям'і служачага. Вучыўся ў Чавускай семігодцы, Магілёўскім педтэхнікуме, Мінскім педінстытуце, з якога за распаўсюджванне «контрэвалюцыйных вершаў» быў выключаны, але пазней аднавіўся і ў 1934 скончыў крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта.

Друкавацца пачаў у 1924 годзе. Аўтар зборнікаў паэзіі «Камсамольскія вершы» і «Штурм» (1930), «Жалезныя віхуры» і «Разбег» (1931), «Стала і мужна» (1932). Працаваў у рэдакцыях газет «Магілёўскі селянін», «Звязда», часопіса «Работніца і калгасніца Беларусі». Выдаў зборнік нарысаў «Крок пяцігодкі» (1931). Разам з С. Грахоўскім пераклаў на беларускую мову раман Жуля Верна «20000 лье пад вадой» (1937). Некаторыя вершы Юркі Лявоннага пакладзеныя на музыку кампазітарамі М. Чуркіным, Н. Сакалоўскім, І. Любанам.



У кастрычніку 1936 года ў Мінску быў арыштаваны. На следстве, аднак, ён (ці не адзін з падследных) не пацвердзіў, што Цішка Гартны «контррэвалюцыянер», «нацдэм» і г.д. Праз год Юрка Лявонны быў асуджаны як «член шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі» і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе. А ў 1960-м выйшаў зборнік яго вершаў «Выбранае».

Пазней С. Грахоўскі ўспамінаў: «Ён гадзінамі чытаў па памяці Маякоўскага і Кірсанава, Ціханава і Лугаўскога. У яго быў тонкі густ да слова, да формы, а пра сябе ён часта гаварыў: “Сапраўднае я яшчэ напішу, значнае наперадзе...”».

Сёння мы прапануем адзін з твораў паэта-пакутніка.

Юрка ЛЯВОННЫ

### Расплюскалася ў прасторы сонца

*Расплюскалася*
*Ў прасторы сонца.*
*Зелянее стромкая трава.*
*Ад жыцця не стану*
*я ў старонцы,*
*Буду ранне шчыра*
*вартаваць.*

*Будуць песні*
*раўчакамі ліцца –*
*І не сядзе на суку тым жаль.*
*Не пахіліць лозаў*
*вецер ніцы,*
*Не загіне ў просіні мяжа.*
*Заглядзіцца месяц*
*сівагрывы,*
*Дол пакрые тонкім*
*серабром.*
*Пройдзе ноч няскончаным*
*урыўкам,*
*Каб схавацца ўранні*
*за гарой.*

*У прасторы –*
*Ураган сваволіць.*
*Льецца з кленаў*
*жоўтае лісцё.*
*Прывітаю я жыццё і словы,*
*Як вітае родны брат*
*сясцёр!..*

*1927 г.*

# Пра повязі Беларусі са светам

***Адразу дзве цікавыя выстаўкі напачатку жніўня запрасілі наведнікаў у залы Нацыянальнага гістарычнага музея.***

Выстаўка «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці», падрыхтаваная філіялам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея была прадстаўлена 8 жніўня. Экспазіцыя працавала да 15 жніўня.

Дамова з дырэкцыяй музея выратаваных каштоўнасцяў па экспанаванні ў Мінску музейных прадметаў з асноўнай экспазіцыі і фондаў была дасягнута летась. А дагэтуль выстаўка паспела пабываць у Нясвіжы, палацы Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі, а таксама ў Польшчы, Расіі і ва Украіне.

У выставачную калекцыю ўвайшло больш за 300 экспанатаў пераважна XVIII–XIX стст., сярод якіх творы выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, рарытэтныя кніжныя выданні, манеты Візантыі, еўрапейскіх краінаў (у тым ліку Рэчы Паспалітай), паясы і кінжалы з Паўночнага Каўказа, срэбныя партсігары, кітайскія дэкаратыўныя накладкі, сярэднеазіяцкі посуд, рыжскі крышталь, узоры растоўскай фініфці, рускага меднага ліцця. Вялікую частку экспазіцыі займаюць творы рускага сакральнага мастацтва – абразы XIX ст.

На прэзентацыі выступілі намеснік Міністра культуры Васіль Чэрнік, дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Аляксей Міцюкоў, начальнік аддзела каардынацыі барацьбы з кантрабандай Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір Гарыфаў, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Алег Рыжкоў, старшыня камісіі «Вяртанне» БФК, сябра апякунскага савета Нацыянальнага гістарычнага музея Адам Мальдзіс. Экспазіцыю прадстаўляла куратар выстаўкі Таццяна Міранoвіч.

Паводле А. Міцюкова, музей выратаваных каштоўнасцяў сёння адзін з самых наведваемых у Брэсце. А працуе ён з 1985 г. Супрацоўніцтва ж Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея з мытнікамі пачалося ў 1953 г., за гэты час ад іх прынята больш за 5 тысячаў прадметаў. Усяго музей захоўвае 165 тысячаў адзінак асноўнага фонду і звыш 200 тысячаў – дапаможнага.

У. Гарыфаў расказаў, што канфіскаваныя пры спробе незаконнага вывазу за мяжу творы мастацтва і прадметы антыкварыяту перадаюцца таксама ў фонды музеяў Гродна, Гомеля і Нацыянальнага мастацкага музея, а прадметы культа – праваслаўнай царкве.

Вялікую цікавасць выклікала выступленне А. Мальдзіса, які ўнёс прапановы адразу ўсім прэзентатарам выстаўкі. Ён заўважыў, што сярод экспанатаў калекцыі пераважна расійскага і ўкраінскага паходжання няма ніводнага беларускага, чым адразу асрэчыў размовы пра «ролю выстаўкі ў спасціжэнні культуры Беларусі». Паколькі гэтыя каштоўнасці не нам належаць, лічыць даследчык, іх трэба выкарыстаць дзеля абмену на нашыя нацыянальныя, якіх шмат засталося з савецкіх часоў у музеях Расіі і Украіны. Звярнуўся і да А. Міцюкова з прапановаю ўзяць шэфства над астравецкім краязнаўчым музеем ды перадаць з запаснікаў у дар ці на часовае захаванне прадметы, што маюць дачыненне да Беларусі.



Тас – шыльда на скрутку Торы

Другая выстаўка – «Пад знакам Меноры. З гісторыі яўрэйства на Беларусі» – 9 жніўня адкрылася пад гукі клезмерскай музыкі. Яна таксама складзеная з экспанатаў, што маюць паходжанне з розных краінаў. Гэта фотаматэрыялы цэнтра спадчыны Менахема Бегіна ў Іерусаліме, архіваў Руці Перэс і інстытута Жабацінскага ў Тэль-Авіве, прадстаўленыя Ізраільскім культурным цэнтрам пры Пасольстве Дзяржавы Ізраіль, творы выяўленчага мастацтва, арыгінальныя рэчы і рытуальныя прадметы са збору іудаістыкі Нацыянальнага гістарычнага музея, Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, копіі фотаздымкаў Саламона Юдовіна, зробленыя пад час этнаграфічных экспедыцыяў 1912–1914 гг. Сямёна Анскага па яўрэйскай рысе аселасці з фондаў Расійскага этнаграфічнага музея (Санкт-Пецярбург).

Гэта не першая выстаўка яўрэйскай тэматыкі ў музеі. А пры падрыхтоўцы чарговай экспазіцыі былі зробленыя адкрыцці, што дазволіла атрыбутаваць некаторыя прадметы, прызначэнне якіх раней не было вядомым.

Як ганаровыя госці прысутнічалі першы сакратар Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Генадзь Палішчук і старшыня яўрэйскай супольнасці Беларусі Леанід Левін. Урачыстасці распачала салістка ансамбля «Радзімічы» Наталля Ліпская, якая заспявала на іўрыце неафіцыйны гімн Ізраіля «Залаты Іерусалім», які падхапілі і некаторыя прысутныя.

Намеснік Міністра культуры В. Чэрнік паведаміў, што 12 жніўня ў Ізраілі пачынаецца тыдзень беларускай культуры, дзе выступяць вядучыя майстры мастацтваў Беларусі. Аналагічныя мерапрыемствы адбудуцца і ў Беларусі.

Л. Левін звярнуў увагу, што цяпер у нашай краіне засталося каля 50 тысячаў яўрэяў, а да Вялікай Айчыннай вайны яны былі самай буйной супольнасцю ў Еўропе. На нашай зямлі загінулі 800 тысячаў яўрэяў. Тут нарадзіліся 7 выбітных дзяржаўных дзеячаў Ізраіля, атрымалі пуцёўку ў жыццё сусветнавядомыя мастакі Шагал, Суцін, Пэн, скульптар Азгур.

Куратар выстаўкі Надзея Саўчанка расказала пра стварэнне экспазіцыі і гісторыю музейнага фонду іўдаікі, што бярэ пачатак са створанага ў 1923 г. яўрэйскага збору Беларускага дзяржаўнага музея. У 1931 г. усесаюзным аб'яднаннем «Антыкварыят» былі адабраныя рэчы з каштоўных металаў для продажу на аўкцыёнах Еўропы. А ў 1943 г. значная частка прадметаў іўдаікі была рэквізаваная і вывезеная ў Вену. Таму цяпер у музеі іўдаіка прадстаўленая небагата – з колішніх дзвюх залаў застаўся невялікі збор. Многія экспанаты выстаўленыя ўпершыню. Сярод іх – тасы, графічныя працы вядомых яўрэйскіх мастакоў Мендэля Горшмана, Льва Альпяровіча, Якава Кругера, Саламона Кішанеўскага, скульптурныя партрэты Якава Паіна. Паводле фатаграфій С. Юдовіна ў выставачнай зале была ўзноўленая шавецкая майстэрня.



Т. Міранoвіч і А. Міцюкоў



А. Мальдзіс

Наш кар.
Фота Наталі КУПРЭВІЧ

***Тэрыторыя Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту разам з гарадзішчам прымеркаваная да паўднёвай часткі Мінскага канцова-марэннага ўзвышша, што непадалёку вытокаў ракі Пціч, якая нясе свае воды на паўднёвы ўсход краіны. Навакольны рэльеф прадстаўлены буйнымі плоскавяршыннымі пакатымі ўзгоркамі, дэнудацыйна-эразійнымі схіламі, далінай ракі Пціч і яе прытока Менкі, равамі і ярамі, тальвегамі, старыцамі, лагчынамі сцёку. Рэльеф быў канчаткова сфармаваны ў час сожскай стадыі дняпроўскага зледзянення каля 100–120 тысячаў гадоў таму. Частка ўзгоркаў, што групуецца на ўсход ад музея (па лініі вёсак Воўчкавічы–Азярцо) у субмерыдыянальную граду з абсалютнымі адзнакамі больш за 250 м (макс. 253,2 м), уяўляе сабой водападзел паміж рэкамі Пціч і Свіслач. Сістэма ўзгоркаў у раёне вёсак Строчыца і Гарадзішча дапасоўваецца да масіву, што падзяляе даліны рэк Пціч і Нёман. Увесь гэты канцоваледавіковы рэльеф аб'ядноўваецца ў Івянецка-Дзяржынскі вуглавы масіў, які ўтварыўся на лёдастыку Верхнянёманскай і Мінскай ледавіковых лопасцяў. Гэта самы буйны ў Беларусі масіў, у якім знаходзіцца найвышэйшая кропка краіны – гара Дзяржынская з абсалютнай адзнакай 345 м.***




# Геаграфічныя і геалагічныя аб'екты Беларускага скансэна

Паверхня ледавіковага рэльефу складзеная тут марэннымі суглінкамі і супяскамі чырвона-карычневага колеру, якія часам агаляюцца ў карэнным беразе ракі Пціч, кар'ерах і выемках. Марэна месцамі перакрываецца пясчана-жвіравым матэрыялам, а таксама прадуктамі дэнудацыі, што ў выглядзе дэлювіяльных паясоў залягаюць каля падножжаў узгоркаў або на схілах лагчынаў.

Даліна ракі Пціч у месцы перасячэння ёю гэтай тэрыторыі ўрэзаная ў ледавіковы рэльеф на глыбіню 20–30 м. Яе шырыня складае тут 100–150 м. За 200 м на поўнач ад вёскі Строчыца рака прарэзала марэнную граду, таму ў гэтым месцы яе даліна самая вузкая. З усходу ў карэнны бераг тут уразаецца мысападобны ўступ у выглядзе марэннага вала, з дапамогай якога рэчышча ўтварае дугу, увагнутую на захад. Гэтае месца з'яўляецца далінай прарыву. У будове рачной даліны добра выражаныя два рознаўзроставыя поплавы – верхні і ніжні. Ніжні поплаў уздымаецца над урэзам ракі на 1 – 1,5 м, а верхні – на 2–3 м. Месцамі над поплавам можна разгледзець невялікія пляцоўкі, якія з'яўляюцца эпізодамі першай надпоплаўнай тэрасы.

У месцы ўпадзення ракі Менкі ў Пціч даліна расшыраецца і становіцца больш забалочанай. На поплаве назіраюцца так званыя прырэчныя валы, утвораныя ў час павадкаў. Валы звычайна выцягнутыя паралельна рэчышчу і чаргуюцца з невялікімі западзінамі, якія запаўняюцца вясной паводкавай вадою. На крутых схілах карэннага берага сустракаюцца агаленні, складзеныя марэнай, перакрытай месцамі лёсападобнымі суглінкамі і супяскамі. Апошнія ўтвораныя шляхам золавай, мярзлотнай і воднай перапрацоўкі падсцілаючых ледавіковых адкладаў і лакалізуюцца больш за ўсё на схілах далінаў рэк, яроў, равоў. Равы прарэзаюць абодва карэнныя берагі ракі і паглыбляюцца ў іх на даўжыню 0,5 – 1,0 км.

У вусцевых частках равоў на паверхні рачнога поплаву сустракаюцца так званыя конусы вынасу. Гэта прадукты пераносу дажджавымі і расталымі водамі адкладаў, вымытых са схілаў равоў, яроў, узгоркаў. Яны адкладзеныя ў выглядзе веераў, што расшыраюцца ў бок ракі Менкі. Даліна яе больш вузкая і менш глыбокая, чым у Пцічы. За 2 км ад вусця Менкі з правага берага ў даліну адкрываецца шырокі (да 550 м) і працяглы (да 2 км) яр з пакатымі схіламі і плоскім дном. На правым беразе Менкі ў месцы зліцця яе з ярам размешчанае рукатворнае маляўнічае гарадзішча. Яно прымеркаванае да рачнога поплаву. Даліна Менкі месцамі забалочаная, парослая кустоўем і хмызняком.



У наваколлі музея і гарадзішча сустракаецца шмат дробных і буйных валуноў. Частка з іх, асабліва дробныя, вымытыя з ледавіковых (марэнных) адкладаў. Больш буйныя засталіся на паверхні пасля таго, як ледавік растаў, і валуны аслабаніліся ад лядовых абцугоў. Усе валуны былі прынесеныя ледавіком з поўначы – Швецыі, Фінляндыі, Карэліі, дна Балтыйскага мора, Прыбалтыкі і інш. Яны ўяўляюць сабой вялікую навуковую цікавасць, бо ўтрымліваюць інфармацыю аб шляхах перамяшчэння ледавікоў і складзе скальных парод паўночных абласцей. Гэтыя экзатычныя сведкі ледавіковай гісторыі краю патрабуюць да сябе ўвагі, іх патрэбна зберагаць, а самыя буйныя аб'яўляць помнікамі прыроды.

Геалагічная будова названай тэрыторыі наступная. Паверхня крышталічнага фундамента залягае тут на адзнаках 210–280 м ніжэй за ўзровень мора. Фундамент перакрыты чахлом пратэразойска-мезазойска-кайназойскіх утварэнняў агульнай магутнасцю больш за 500 м. У іх склад уваходзіць верхнявендска-ніжнекембрыйскі комплекс адкладаў (валынская і валдайская серыі верхняга венду – балтыйская серыя ніжняга кембрыю). Гэтыя ўтварэнні перакрываюцца пераважна дэвонскімі, мелавымі, ракушачнікавымі і антрапагенавымі адкладамі. Паверхня дыантрапагенавых адкладаў залягае пераважна на адзнаках плюс 50–60 м і слаба перапрацаваная плейстацэнавымі ледавікамі. Магутнасць адкладаў, што ўтварыліся на працягу антрапагенавага перыяду (ён пачаўся каля 1 млн гадоў таму), складае тут 180–200 м. У будове антрапагенавых утварэнняў прымалі ўдзел усе зледзяненні. Адклады першага з іх – нарэўскага – залягаюць у нізе антрапагенавай тоўшчы на глыбіні каля 150 м. Яны прадстаўленыя валуннымі супяскамі (марэнамі) зеленавата-шэрага колеру, а таксама жвірам, галькай, пяском, якія ўтварыліся ў ходзе разбурэння ледавіка. Найбольш магутныя тоўшчы (да 50–60 м) пакінуў бярэзінскі ледавік. І, нарэшце, у час дняпроўскага зледзянення дзвюма яго магутнымі пасоўкамі быў канчаткова створаны сучасны рэльеф тэрыторыі, які пасля адступання зледзянення быў крыху зменены працэсамі эрозіі, дэнудацыі і інш.

**Міхась ЗУСЬ**




**Васіль ЗУЁНАК**

## Развітанне Каліноўскага

*Хто адгадае і хто адкажа, –*
*Пакуль маўчыць народ,*
*Якая праўда на сэрца ляжа*
*Мне праз тысячу год?*

*Адно толькі знаю:*
*Бог нас пакінуў.*
*Страшней пятлі і турмы,*
*Калі мы ўсё яшчэ*
*не краіна:*
*То край, то ўскраіна мы.*
*Адно толькі знаю:*
*паўстаць за волю –*
*Сваю – павінен народ.*

*Інакш вольным не быць ніколі.*
*Рэкі ўзрываюць лёд.*

*Шляхі не купляюць*
*за пяць капеек –*
*Бяруць іх жыццём сваім.*
*Бунт не на плошчы – у сэрцы спее*
*І памірае ў ім.*
*Пакуль застаецца*
*з нашага стану*
*Хоць бы адзін жывы,*
*То не лічыце справу*
*прайгранай.*
*Народ прад'явіць правы.*

**Рыгор СЕМАШКЕВІЧ**

## Апошняя ноч Каліноўскага

*Заўтра ўсё... Заўтра смерць.*
*Мяне выведуць каты.*
*Сакавік на двары..*
*Яшчэ тыдзень –*
*і птушкі дамоў,*

*О буслы, дзеці сонца!*
*Летучы, адшукайце вы хату,*
*Дзе жыве маё шчасце,*
*якога ў жыцці не знайшоў.*
*У вясковай красе!*

*Ясна-чыстая, нібы бяроза.*
*Вуснаў не цалаваў*
*і яе не насіў на руках.*
*Птушкі! Людзі казалі...*
*Прашу вас праз слёзы –*
*Укіньце вы ёй праз комін*
*маленькага хлапчука.*
*Хай ён будзе маім!*
*Тую дзеўчыну вы папрасіце.*
*У краіне цяпер будуць вісельні,*
*здзекі і жах.*
*Будзе слухаць ён*
*жаль перапёлкі*
*у стоптаным жыце,*
*Песні ціхія з прызбаў*
*па вечарах.*
*Веру – кроў мая*
*ў сэрца яго застукоча.*

*І калі прыйдзе час*
*новай гнеўнай касьбы,*
*то ізноў, –*
*Хай жа пільнымі будуць*
*і ноччу*
*і днём яго вочы.*
*І пажары палацам! За мову,*
*за слёзы, за кроў!..*
*Хлопчык мой!*
*Я цябе, дарагі, абдымаю.*
*На радзіме маёй*
*здратаванай*
*павінен ты быць.*
*Крокі ў лёхах!*
*Ужо і світаць пачынае!*
*Беларусь, мая маці!*
*Ты будзеш,*
*адзіная, жыць!*



*Паўстанцы 1863 г. на тагачасным малюнку*

# Кіраўнік хору

## *«Аб нечым расказвае і малюе формулы, як песню спявае»*

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 2)*

Да глыбокай старасці Леў Міхайлавіч захаваў светлы розум. Нават у 90-гадовым узросце ён дапамагаў рабіць некаторым смілавіцкім студэнтам-завочнікам кантрольныя працы па матэматыцы, фізіцы і хіміі.

Сустракаючыся з сябрамі, часта ўзгадваем гэтага цудоўнага смілавічаніна. Шмат цікавага ўспамінаюць пра свайго былога выкладчыка яго вучні: Леанід Маліноўскі, які працаваў асістэнтам, а затым намеснікам дырэктара Смілавіцкага сельгастэхнікума; Эдуард Гаравы, заслужаны майстар спорту, экс-чэмпіён СССР сярод сельскіх спартсменаў па лёгкай атлетыцы; Пётр Ціва, доктар сельскагаспадарчых навук; Уладзімір Стрэльскі, вядомы гарпунёр і капітан карабля; Яфім Шапіра, настаўнік вышэйшай катэгорыі, мастак і паэт.

– Я паступіў у Смілавіцкі тэхнікум у 1951 годзе пасля заканчэння сямі класаў Драчкаўскай сямігодкі, – распавядае Л. Маліноўскі. – У адзін з першых дзён нашай вучобы ў тэхнікуме класны кіраўнік групы Антаніна Сямёнаўна загадала ўсім ісці ў хор. Мы, першакурснікі, стаялі табуном на сцэне, а кіраўнік хору Леў Міхайлавіч пачаў напяваць розныя гукі, мы паўтаралі. Я вельмі стараўся, гарланіў як толькі мог. Кіраўнік хору слухаў-слухаў, пераставіў мяне з аднаго месца ў другое, а потым паклікаў: «Хлопчык, ідзі сюды». Я падыходжу. «Ты з якой групы?» Я называю. «Хто ў вас класны кіраўнік?» – зноў пытае. Адказваю. «Чаго, хлопчык, цябе сюды прыслалі?» – «Антаніна Сямёнаўна загадала». У мяне быў вельмі зычны голас. Зычны, але не меладычны, ён нагадваў рыпенне нязмазаных колаў. «Хлопчык, у хор ты больш не хадзі», – папрасіў кіраўнік. Я спужаўся. Трапіў сюды з маленькай вёсачкі Палянка, і Смілавічы здаваліся мне ледзь не цэнтрам Сусвету. А настаўніца папярэдзіла, што кожны, хто не пойдзе на рэпетыцыю, павінен будзе заплаціць штраф – рубель. Яна жартавала, але я ўсё прыняў за чыстую манету. Дзе я мог узяць той рубель, калі мы радыя былі кавалку хлеба, які штодзённа атрымлівалі ў сталоўцы тэхнікума? Аб гэтым збянтэжана прамямліў нашаму дырыжору. Леў Міхайлавіч дастаў з кішэні тры рублі. Для нас гэта былі вялікія грошы. Падаў мне: «Перадай, хлопчык, сваёй настаўніцы гэты штраф, і каб яна цябе больш не прысылала ў хор». Я разгубіўся, а дырыжор сказаў, што вызваляе ад абавязку і заплаціць за мяне штраф... З таго часу ў хор я больш не хадзіў, а запісаўся ў іншыя гурткі і секцыі. А хор Смілавіцкага тэхнікума пад кіраўніцтвам Льва Міхайлавіча быў выдатны! Наогул, гэта быў таленавіты выкладчык, тонкі спецыяліст, адразу мог зацікавіць любога. Як цяпер помню, у аўдыторыі № 3 другога корпуса тэхнікума (былога палаца Ванькавічаў-Манюшкаў) ён выкладаў у нас хімію. Аўдыторыя была незвычайная, з нахілам, як у тэатры. Леў Міхайлавіч адчыняе дзверы, мы ўстаем, а ён ужо нешта цікавае са свайго жыцця расказвае. Усе навастрылі вушы. Я хімію не любіў, але з цікаўнасцю слухаў выкладчыка. Такіх ніколі не чуў і не бачыў. А ён аб нечым расказвае і малюе формулы на дошцы, як песню спявае. Усё патрэбнае само адкладваецца ў падсвядомасці. Званок, а выкладчык, выходзячы за дзверы, ужо ў калідоры зноў нешта цікавае расказвае. Такі ў яго быў незвычайны метад зацікавіць слухачоў... Калі быў 70-гадовы юбілей настаўніка, мы з’ехаліся да Льва Міхайлавіча ў Смілавічы з розных куткоў Савецкага Саюза.



*Л. Позняк з жонкай і дачкой*



*Са студэнтамі пад час практычных заняткаў*

Яфім Шапіра, сусед Л. Позняка, успомніў кур’ёзны выпадак, пра які вельмі доўга з рогатам успаміналі ў Смілавічах:

– Леў Міхайлавіч і сам быў вялікі жартаўнік. Пасля вайны ён працаваў намеснікам дырэктара Смілавіцкага сельгастэхнікума. Конкурс пры паступленні быў вялікі. Час быў цяжкі, а тут, у сельскагаспадарчым тэхнікуме, не толькі стыпендыю плацілі, а яшчэ і кармілі два разы на дзень. Ад той кармёжкі распаўнець было немагчыма, але выжыць можна было. Абітурыенты, і асабліва іх бацькі, шукалі магчымасць любой цаной паступіць туды. А Леў Міхайлавіч у час тых прыёмных іспытаў выконваў абавязкі дырэктара. І вось па тэхнікуме пракацілася чутка, што Позняк на самой справе – ніякі не беларус, а яўрэй, але хавае сваё сапраўднае імя – Лейба Мойшавіч. Смілавіцкія жартаўнікі параілі прыезджым, каб зрабіць прыемнае выканаўцу абавязкаў дырэктара і мець гарантыі на паступленне, ва ўступнай заяве пісаць замест «Льву Міхайлавічу» поўнае яўрэйскае... Спачатку гэта выклікала гамерычны рогат сярод выкладчыкаў тэхнікума і ў самога Позняка. Але потым яму стала не да смеху. Не трэба забывацца, што вядомага рэвалюцыянера Троцкага звалі Лейба, да таго ж, быў час антысемітызму і таталітарызму. «Справа ўрачоў», калі групу ўрачоў-яўрэяў абвінавацілі ў падрыхтоўцы замаху на жыццё «правадыра ўсіх народаў», была на вуснах кожнага. Навісла пагроза, што за Льва Міхайлавіча (як і за ленінградскіх урачоў) возьмуцца «органы», з учэпістых лапаў якіх вырвацца было немагчыма. Паспрабуй даказаць, што ты – ад дня нараджэння не Лейба (як Троцкі), а Леў (як Талстой). У чалавека схапіла сэрца (ці прыкінуўся хворым), і на нейкі час ён злёг у бальніцу, каб схавацца ад злых людзей.

*Шмат гадоў яе перадавалі па беларускім радыё ў нашым выкананні. Так і прадстаўлялі: «“Лясная песня” ў выкананні Смілавіцкага народнага хору»*

Успамінае Эдуард Гаравы:

– Л. Позняк быў надзвычай культурны і унікальны чалавек. У хіміі, фізіцы, матэматыцы быў адмысловец. Любіў і выдатна ведаў музыку. Нас ён нотнай грамаце не вучыў. Арганізаваны ім у Смілавіцкім тэхнікуме хор выступаў у 1953 годзе на конкурсе песні ў Акруговым доме афіцэраў Беларускай ваеннай акругі ў Мінску. Мы ўпершыню выканалі песню «Ой, бярозы ды сосны», якую толькі што напісаў У. Алоўнікаў. Пасля шмат гадоў яе перадавалі па беларускім радыё ў нашым выкананні. Так і прадстаўлялі: «“Лясная песня” ў выкананні Смілавіцкага народнага хору». Таму ў мяне ёсць гонар і за наш тэхнікум, і за нашы Смілавічы. Калі мы пад кіраўніцтвам свайго выкладчыка праспявалі яе ў Доме афіцэраў, падняліся на сцэну Уладзімір Алоўнікаў, Адам Русак, Якуб Колас і нехта з беларускага кіраўніцтва. Яны ўсе ціснулі нам рукі, дзякавалі за добрае выкананне. Я да гэтага часу памятаю поціск рукі Якуба Коласа.

*Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,*
*г. Мінск*



*Смілавіцкі народны хор і яго кіраўнік*




# Развіццё краязнаўства ў Беларусі ў міжваенны перыяд

## Развіццё краязнаўства ў БССР

У гады Першай сусветнай вайны, рэвалюцыі і ваеннай інтэрвенцыі сістэматычнай краязнаўчай працы не вялося. Л. Аляксееў сведчыць, што краязнаўчыя арганізацыі тады ўтвараліся стыхійна. У Слуцку, некалькіх вёсках Ігуменскага павета з’явіліся краязнаўчыя таварыствы і гурткі. У Мінску дзеячамі беларускага нацыянальнага руху было створана некалькі грамадскіх арганізацыяў, якія ўздымалі пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны: таварыства беларускай культуры «Прасвета», беларускае культурна-асветнае таварыства «Бацькаўшчына», моладзевыя арганізацыі. У польскім краязнаўчым часопісе «Зямля» паведамлялася, што ў кастрычніку 1918 г. у Мінску ўзнікла Польскае таварыства прыяцеляў навук, у ліку секцыяў якога была і краязнаўчая. Прысутнасць на сходзе 80 чалавек сведчыць аб зацікаўленасці мінчанаў у развіцці і папулярызацыі навуковых даследаванняў. З перапынкамі таварыства вяло краязнаўчую і архіўную працу і ў 1920 г. Краязнаўчы кірунак прысутнічаў у дзейнасці Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў (1919, 1920–1925), сябрамі якога былі У. Пічэта, М. Янчук, П. Харлампові́ч, настаўнікі і аматары гісторыі. Разам са стварэннем новага ў краязнаўстве, на жаль, мелі месца факты разбурэння набыткаў шматгадовай дзейнасці. Так, у пачатку 1920-х гг. у Віцебску былі знішчаныя бібліятэка і музейная калекцыя Віцебскага аддзялення маскоўскага Археалагічнага інстытута і закрыты сам інстытут, бібліятэка і калекцыя царкоўных старажытнасцяў, створаныя А. Сапуновым і Е. Раманавым.

Стварэнне БССР мела велізарнае культурна-гістарычнае значэнне для беларускага народа. Абвешчаныя камуністычнай партыяй і савецкім урадам новыя сацыяльныя ідэалы, нацыянальна-культурнае разняволенне беларусаў, як і іншых этнічных меншасцяў Расійскай Імперыі, выклікалі ў 1920-я гг. незвычайны грамадскі ўздым, інтарэс да гісторыі, беларускай мовы і культуры. Менавіта ў гэты перыяд была створаная выдатная беларуская мастацкая літаратура, расквітнелі мастацтва, навука, краязнаўчы рух. Гарадская і вясковая інтэлігенцыя, навучэнцы, студэнты аб’ядноўваліся для вывучэння сваіх родных мясцінаў, вучоныя распрацоўвалі гістарычныя і сучасныя аспекты рэгіёназнаўства. Так, у Слуцкім павятовым аддзеле народнай адукацыі ў 1922 г. была створаная павятовая камісія беларусазнаўства, якая ставіла задачы вывучэння і даследавання Беларусі, і асабліва Слуцкага краю. Члены камісіі праводзілі экспедыцыі па вёсках, пад час якіх было зроблена больш за 2 000 замалёвак народнага арнаменту, сабраныя гістарычныя каштоўнасці, напрыклад, партрэты князёў Алелькавічаў. Са збораў камісіі вядзецца гісторыя Слуцкага краязнаўчага музея. Праз год камісія беларусазнаўства была рэарганізаваная ў Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства.

Краязнаўчы рух у БССР у міжваенны час у арганізацыйным аспекце ўяўляў складаную сістэму. Асноўнымі кампанентамі яе былі грамадскі краязнаўчы рух, прадстаўлены краязнаўчымі арганізацыямі розных узроўняў, дзяржаўнае краязнаўства, якое вялося навуковымі, гаспадарчымі, культурнымі ўстановамі, у т.л. бібліятэкамі, ВНУ, школьнае краязнаўства, краязнаўчы друк.

Адметнымі і ўзаемазалежнымі рысамі краязнаўства ў БССР былі яго масавасць і дзяржаўная падтрымка. Дзяржаўная падтрымка ў 1920-я гг. дабратворна паўплывала на развіццё краязнаўства, фармаванне яго новых кірункаў, надала яму вялікі размах, шматлікі колькасны склад удзельнікаў абумовілі асаблівасці арганізацыйнай структуры. Але пад уплывам змены дзяржаўнага курса ў адносінах да палітыкі беларусізацыі ў канцы 1920-х гг. улады стварылі атмасферу, небяспечную для краязнаўчай дзейнасці, арганізавалі рэпрэсіі супраць краязнаўцаў.

Грамадскі краязнаўчы рух і краязнаўства ў цэлым у БССР на працягу 1923–1936 гг. узначаліла Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). ЦБК, створанае ў канцы 1923 г., з’яўлялася самастойнай структурнай адзінкай Інбелкульта – галоўнай шматгаліновай навуковай установы рэспублікі. Функцыянаванне ў складзе Інбелкульта паказвала важнасць краязнаўства як галіны даследчай дзейнасці. Першапачатковa ў склад ЦБК былі ўведзеныя вядомыя вучоныя – географы А. Смоліч, М. Азбукін, гісторыкі У. Пічэта, В. Друшчыц, аграрнік С. Скандракоў (сакратар), прадстаўнікі ад Галоўпалітасветы і іншых арганізацыяў. Значны асабісты ўклад у стварэнне ЦБК унёс першы старшыня Інбелкульта грамадска-палітычны дзеяч і вучоны-мовазнавец С. Некрашэвіч. Стварэнне ЦБК пры Інбелкульце паказвала, што за ўзор цэнтра краязнаўчага руху быў узяты вопыт РСФСР, дзе ў 1922 г. пачалася дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Расійскай акадэміі навук.

У 1925 г. быў абраны новы склад ЦБК, куды ўвайшлі П. Вілянстовіч (старшыня), Р. Шукевіч-Трацякоў (намеснік старшыні), С. Скандракоў (сакратар), В. Друшчыц, М. Азбукін, І. Сербаў, Кандрат Крапіва, прадстаўнікі ад секцыяў Інбелкульта, Саюза працаўнікоў асветы, БДУ, Сельскагаспадарчага інстытута, Цэнтральнай статыстычнай управы, Галоўпалітасветы, Цэнтрархіва і іншых арганізацыяў.

Кіраванне дзейнасцю ЦБК і яго фінансаванне ажыццяўлялася Прэзідыумам Інбелкульта, перад якім ЦБК трымала справаздачы. Задачы і змест працы ЦБК вызначаліся яго статутам, які быў зацверджаны ў 1928 г. Прэзідыумам Інбелкульта. ЦБК праводзіла пленумы, з’езды і канферэнцыі. Узначальвалі ЦБК дзеячы, здольныя рэалізаваць дзяржаўныя інтарэс і бягучы ідэалагічны курс, – П. Вілянстовіч, М. Бялуга, В. Серафімаў. У самы плённы перыяд існавання ЦБК, 1925–1929 гг., яго старшынёй быў Павел Вілянстовіч, буйны партыйны і дзяржаўны дзеяч. Адным з самых актыўных быў вучоны сакратар ЦБК М. Каспяровіч. Частыя змены старшыняў паказваюць хісткую, залежную ад унутранага ідэалагічнага курса, сітуацыю ў арганізацыйным цэнтры краязнаўства.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці ЦБК былі: арганізацыя краязнаўчага руху і кіраванне ім, каардынацыя краязнаўчай дзейнасці, арганізацыя навуковых краязнаўчых даследаванняў.

ЦБК узначаліла фармаванне сеткі краязнаўчых таварыстваў, рэгістравала іх, спрыяла вырашэнню найважнейшых пытанняў краязнаўчага руху. У 1924 г. было зарэгістравана 19 краязнаўчых арганізацыяў: Віцебскае і Магілёўскае акруговыя, Сенненскае, Бешанковіцкае, Лёзненскае раённыя і іншыя, але колькасць іх бесперапынна павялічвалася, што выклікала патрэбу абмеркаваць праблемы краязнаўства на рэспубліканскім узроўні. З мэтай вырашэння галоўных задачаў, напрамкаў і формаў краязнаўчай працы пад кіраўніцтвам ЦБК адбыліся два Усебеларускія краязнаўчыя з’езды і тры канферэнцыі. У акругах і раёнах скліваліся рэгіянальныя краязнаўчыя канферэнцыі, на якіх абмяркоўваліся актуальныя арганізацыйныя пытанні, задачы краязнаўчай дзейнасці і вынікі даследчай і пошукавай працы. Шырокі кадравы склад краязнаўцаў быў прыкметным папаўненнем нешматлікіх прафесійных навуковых рэсурсаў. Падначаленасць Інбелкульту гарантавала непасрэднае ўзаемадзеянне краязнаўчых арганізацыяў і навуковых структураў у вывучэнні рэгіёнаў Беларусі.

*Валянціна САІТАВА*

**Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42–44 за 2012 год, №№ 2–8, 12–17 за 2013 год**

*(Працяг будзе)*




***(Працяг. Пачатак у №№ 21–29)***

### *Вяртанне*

Шлях дадому быў не простым. Але ж дадому, не на чужыну – цеплілася надзея на лепшае, таму цяжкасці і перашкоды, меркавалі, мінулі. Пад’ехалі на аўтамашыне, як у душагубцы (бо перапоўненая была яна людзьмі), да ракі Одар. На адным беразе стаяла Чырвоная Армія, а на другім – амерыканцы. Высаджвалі ўсіх на бераг. Праз нейкі час падплыў катар, і пачалі перапраўляць людзей. А там, на польскай тэрыторыі, сустракалі палонных савецкія салдаты. Неўзабаве пачало здавацца, быццам увесь бераг запоўнілі палонныя, нібыта ўвесь беларускі народ перавезлі ў Нямеччыну. Гучаў смех, нехта спрабаваў заспяваць, аднекуль чулася музыка – хтосьці прыбярог гармонік...

«Хто ведае, як сустрэнуць улады дома? Ці паверацьшто не добраахвота яны паехалі ў Нямеччыну? Будуць глядзець, як на людзей іншага кшталту», – думалі многія. З нечай прапановы Буралі знішчылі ўсе дакументы, што мелі пры сабе. Цудам захавалася фатаграфія Вікенція Фаміча з лагерным нумарам. Астатняе ўсё згарэла сінім полымем. Засталіся людзі, як жывёла – ніякіх пры сабе не мелі пасведчанняў.

Квітнеў май. Цвіла чаромха, паласкала белыя гронкі ў вадзе. У садах пачыналі зацвітаць раннія гатункі яблыняў. А ўдалечыні, колькі дзясяткаў кіламетраў праехаць, – родныя бярозкі, на лузе рамонкі, жытняе поле, льняны палетак... Чэрствыя душы паступова адтавалі.

Непадалёку – чыгунка, палонныя тоўпіліся там. Нехта сказаў, што далей паедуць цягнікамі.

Дарослыя, як дзеці, весяліліся, танчылі, цалаваліся, сустрэўшы знаёмых, землякоў.

Неўзабаве бадзёра зачмыхаў на станцыі паравоз. Кінуліся людзі займаць месцы. Кожнаму хацелася як хутчэй трапіць у родны куточак. Калі цягнік пад’ехаў да Варшаўскага моста, прыпыніў ходу. Пераезд праз раку Віслу.

– Вагоны перапоўненыя, можам не пераехаць – не вытрымае мост. Некалькі чалавек павінныя часова пакінуць вагоны! – патлумачылі праваднікі, ідучы па праходах. Выйшаў з кабіны машыніст – чакаў, калі нехта пакіне вагон, пяройдзе па мосце, а на тым беразе людзей падбяруць.

Раптам стала ціха-ціха. Ніхто не зварухнуўся з месца. «А раптам мяне высадзяць і тут пакінуць», – у кожнага ў галаве закралася думка.

Давялося машыністу рызыкнуць. Калі вагоны заляскалі на другім беразе ракі:

– Пераехалі! – мёртвую цішыню парушылі радасныя крык, смех, жарты.

Далей шлях ляжаў праз Беласток на Брэст.

Вось і дзяржаўная мяжа! Людзі заварушыліся, па вагонах пачалі адшукваць землякоў, знаёмых.

З Брэста цягніком Буралі з землякамі прыехалі ў Глыбокае. Адтуль да дому – рукой падаць. 30 кіламетраў для шаркаўчанаў была не адлегласць – дабіраліся пешшу. Калі ішлі, не маглі пазнаць некалі знаёмыя мясціны: спаленыя хаты, разбураныя дарогі...

Доўгі час Буралі заставаліся безыменнымі, без аніякіх дакументаў на руках. Па крупінках узнаўлялі сваю прыналежнасць.

Свайго дома ў іх не было, шукалі прытулак у выпадковых, але добрых і спагадлівых людзей. Прыехалі ў вёску Амбросенкі. Жылі то ў адной, то ў другой сям’і, у незнаёмых людзей, якія потым сталі як роднымі на ўсё жыццё. У вёсцы была пачатковая школа. Марыя пасля 13 гадоў пайшла ў першы клас. Чатыры гады правучылася, больш не было магчымасці; а яшчэ саромелася свайго высокага росту, які выдзяляў сярод аднакласнікаў.

***(Працяг на стар. 8)***

*(Працяг. Пачатак на стар. 7)*

Бацька падарваў здароўе ў палоне, і зарабляць на хлеб даводзілася ёй з маці. Тамаша забраў брат у Свярдлоўск (цяпер Екацярынбург). А рэшту жыцця правёў ён у латвійскім горадзе Саласпілс.

Уся праца на зямлі легла на маладыя плечы Марыі. У 16 гадоў навучылася касіць, жаць, хадзіць за плугам. У вёсцы дзяўчатаў многа было, а хлопцаў на пальцах пералічыць можна. Вось і даводзілася самім выконваць непасільную працу, нават тую, што павінны рабіць мужчыны.

Пасляваенная прага да жыцця згладжвала ўсе цяжкасці. З 1946 па 1952 гады выдаліся неўраджайнымі. Панавалі бедната і голад. Засявалі поле ўручную, а потым сярпамі жалі жыта і пшаніцу, цапамі малацілі ў пуні; сена нарыхтоўвалі таксама ўручную. Але ўсю працу рабілі з задавальненнем, не сумавалі і радаваліся жыццю. Як дзень жыве сонцам, так вёска жыла песнямі.

Ад перанесеных пакутаў і хваробаў Вікенцій Фаміч пакінуў гэты свет у 67 гадоў. Так і не здзейсніў сваёй мары – не пабудаваў уласны дом. На 15 гадоў перажыла мужа Міхаліна Якаўлеўна. За гэтыя гады ніхто не спытаў у жанчыны, як яна жыла. Ветэранаў вайны было многа, і большасць з іх заставалася не заўважанай.

Ціхая, лагодная, разважлівая Міхаліна Якаўлеўна любіла жыццё, людзей, але гады бралі сваё. Нястрымнай, такой горка-безнадзейнай пакутаю поўнілася сэрца. Хацелася ўсім расказаць пра цяжкі лёс. Але тады ў кожнай сям'і было сваё гора, таму не вельмі прыслухоўваліся да яе расказаў. А моладзі, якая нарадзілася ў пасляваенныя гады, не верылася, што такое магло быць. Жанчына ўлетку хадзіла па падворку (калі жыла ў дачкі ў панскім фальварку Паянчы), абапіраючыся на кіёчак, з белай хусцінкаю ў руках. І раз-пораз выцірала ёй вочы.

Аднойчы са шкадаваннем і адчаем у душы Міхаліна Якаўлеўна прызналася суседцы Франі (яна часта з ёю размаўляла адкрыта): «Каму я ўжо на гэтым свеце патрэбная? Пражыла свой век». Франя пачала сяброўку супакойваць, маўляў, кожнаму час адмераны лёсам, дадзены Богам… Як адчувала, што старая ўдумала нешта нядобрае…

Надышоў вечар. Усе ў сям'і Рыжых палеглі спаць, толькі Марыя завяршала свае хатнія справы. Раптам, знянацку, бэнц – і ікона, якая гадамі там вісела, звалілася з покуці. Шкло разбілася, гук парушыў начную цішу. Першай прачнулася Яніна:

– Гэта нядобрая прыкмета. Нехта адыйдзе з нашай сям'і, – якатала напужаная жанчына.



*Т. Бурэль з жонкай (фота 1981 г.)*

Дзяўчаты Стася, Марыя і Аліна Руткевічы, якія жылі ў адным двары з Міхалінай Якаўлеўнай, часта слухалі расказы старэнькай бабулі, але не надалі вялікага значэння і той споведзі, якую правяла з імі ў апошні раз пасля размовы з Франяй.

Быў цёплы летні дзень. Як звычайна, Антон з Марыяй пайшлі на працу ў калгас. Яніна нешта вязала пруткамі. Міхаліна Якаўлеўна, абапіраючыся на кіёчак, выйшла на вуліцу, дзе гулялі малыя – гарэзы Руткевічы.

– Дзяўчынкі! – раптам падазвала да сябе бабуля. – Мне вельмі забалела галава, нават зямля закружылася перад вачыма.

– Вазьміце пігулачку, – параілі тыя.

Дзяўчаты ведалі, што ў яе кішэні былі розныя лекі ад усіх хваробаў. Паднеслі кубачак вады.

Вялікімі глыткамі адпіла жанчына і адхіліла кубак.

– Не, дзяўчынкі, я лепш прайдуся па двары.

І яна, абапіраючыся на кіёчак, маленькімі крокамі прайшлася вакол хаты, каля хлява, потым па пратаптанай сцяжынцы пайшла да рэчкі. Падышла да кладачкі, побач на беразе ўторкнула ў зямлю свой заўсёдны кіёчак, каля яго паклала сваю белую хустачку: маўляў, шукайце мяне тут.

*(Заканчэнне ў наступным нумары)*

***Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі***

Ганна ідзе да магазіна, нясе дзве цяжкія сумкі. Следам крочыць Іван і кажа:

– Ганна, табе, мусіць, цяжка?

– Ага, нялёгка.

– От, Ганна, каб я не быў у водпуску, то падмог бы табе.



## Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 29

**Уздоўж**: **1.** Следапыт. **4.** Брусніцы. **8.** Іўе. **9.** Рог. **11.** Ганцавічы. **12.** Сцягі. **14.** Давыд. **16.** Азарт. **17.** Сонца. **18.** Пчала. **19.** Пінск. **21.** Ландо. **22.** Мазыр. **27.** Мядзведзь. **29.** Кол. **30.** Ёга. **31.** Фаніпаль. **32.** Спадчына.

**Упоперак**: **2.** Егер. **3.** Пегас. **5.** Ушачы. **6.** Ігра. **7.** Сказ. **8.** Ірыска. **10.** Гродна. **13.** Герольд. **15.** Асобіна. **18.** Полацк. **20.** Карона. **23.** Вясна. **24.** Явар. **25.** Дзева. **26.** Млын. **28.** Мёры.

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**МІЦКЕ́ВІЧА АДА́МА ДОМ-МУЗЕ́Й у Навагрудку** – літаратурна-мемарыяльны музей. Загад аб стварэнні музея выдадзены 16 верасня 1920 г. Навагрудскім павятовым рэўкамам з ініцыятывы добраахвотнага навуковага таварыства «Міцкевічаўскі камітэт», але не ажыццёўлены ў сувязі з тым, што паводле Рыжскай мірнай дамовы 1921 г. Навагрудак адышоў да Рэчы Паспалітай.



*Дом Міцкевічаў на фота Паддубскага (1935 г.)*

Адкрыты музей у 1938 г. у будынку, пастаўленым на месцы дома бацькоў паэта. У Вялікую Айчынную вайну разбураны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Адноўлены ў 1955 г. да 100-годдзя з дня смерці Міцкевіча. У 1989–1990 гг. рэканструяваны (будынку нададзены выгляд пачатку XIX ст., пабудаваны флігель, свіран, студня, альтанка). Сучасная экспазіцыя дзейнічае з 25 мая 2001 г.

Плошча экспазіцыяў 215 м², 7 614 адзінак захоўвання, з іх асноўнага фонду – 5 668 адзінак (2008). Дакументы і матэрыялы расказваюць пра жыццёвы і творчы шлях паэта, яго грамадскую дзейнасць, сувязь з Беларуссю, пра сяброўства з рускімі пісьменнікамі і дзекабрыстамі. Сярод экспанатаў фотакопіі рукапісаў, 9 прыжыццёвых выданняў твораў паэта і сучасныя выданні, яго кнігі ў перакладах на замежныя мовы, асабістыя рэчы (акуляры, кішэнны гадзіннік, настольны гадзіннік канца XVIII – пачатку XIX стст., што знаходзіўся ў пакоі А. Міцкевіча ў Вільні, і інш.), пратаколы судовых пасяджэнняў, шафы пач. XIX ст., «Біблія» на французскай мове, выдадзеная ў 1775 г., бронзавы бюст А. Міцкевіча на гранітным пастаменце, заказаны да 100-годдзя з дня нараджэння паэта яго дачкой М. Гарэцкай, бронзавая мадэль помніка Міцкевічу ў Парыжы, набытая музеем у 1937 г. ва ўдавы скульптара Э. Бурнэля, рукапісы вершаў Кандрата Крапівы, П. Пестрака, Ю. Гаўрука, Я. Семяжона, карціны мастакоў XIX – пач. XX стст. В. Ваньковіча, Р. Мясаедава, творы жывапісу, графікі і скульптуры сучасных беларускіх майстроў Л. Асецкага, А. Глебава, П. Крохалева, А. Шыбнёва, прысвечаныя паэту. Асобны раздзел прысвечаны паўстанню пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі 1794 г.



*Фрагмент экспазіцыі*

Штогод у выставачнай галерэі праходзіць блізу 10-і выставак; дзейнічаюць пастаянныя выстаўкі: этнаграфічная «Малюнкі сельскага жыцця», керамічны посуд XIX ст. «Свет кухні Міцкевічаў», «Паэма "Пан Тадэвуш" – праз гады і народы», на якой прадстаўленыя ўсе выданні твора ад сяр. XIX ст.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

**Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.**

**Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.**

**Рэдкалегія:** Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26, 334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 15.08.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 719.
Тыраж 1010 асобнікаў.